РАЗАМ — ЗА МОЦНУЮ І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1–3-й стар.)

Сярод найважнейшых праектаў — будаўніцтва азотнага комплексу і цэха па вытворчасці азотнай кіслаты на «Гродна Азот», мадэрнізацыя прадпрыемства «Лакафарба» і іншыя.

У Мінскай вобласці, якая паказала самы лепшы вынік сярод рэгіёнаў за пяцігодку, трэба будзе ўзвесці горна-ўзбагачальны комплекс на базе Старобінскага радовішча ў Любанскім раёне, пабудаваць завод парашковых фарбаў у Вілейскім раёне, стварыць новую вытворчасць па перапрацоўцы другасных палімерных адходаў на Барысаўскім заводзе пластмасавых вырабаў, пашырыць вытворчасць легкавых аўтамабіляў. Адным з кірункаў інавацыйнага развіцця прамысловасці рэгіёна стане стварэнне навукаёмістых вытворчасцяў у сферах біятэхналогіі, тонкай хіміі, новых матэрыялаў, машынабудавання, электронікі, лагістыкі на базе індустрыяльнага парка «Вялікі камень» у Смалявіцкім раёне.

Перспектывы Магілёўскай вобласці, якая заняла сёмае месца ў пяцігодцы, звязаны з нарошчваннем хімічнай вытворчасці, выпускам пластмасавых вырабаў і новых тыпапамераў шын. Асаблівай увагі запатрабуе рэалізацыя мэтавай праграмы па комплексным сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўшчыны (Крычаўскі, Клімавіцкі, Краснапольскі, Касцюковіцкі, Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі і Хоцімскі раёны). Праграма зацверджана.

Стратэгія развіцця горада-героя Мінска (па выніках пяцігодкі, на жаль, пятае месца) прадугледжвае апераджальнае развіццё высокапрадукцыйных сектараў эканомікі, прадпрыемстваў якіх у найбольшай ступені сканцэнтраваныя ў сталіцы. Асаблівая ўвага таксама будзе нададзена ўкараненню перадавых «горадабудаўнічых» тэхналогій («разумны горад» і цэлы шэраг іншых).

Усім рэгіёнам неабходна вырашэнне важнай экалагічнай праблемы — забруджванне бытавым смеццем. Нягледзячы на функцыянаванне смеццеперапрацоўчых прадпрыемстваў практычна ва ўсіх буйных і сярэдніх гарадах краіны, доля такога смецця павялічваецца з кожным годам. У сувязі з гэтым неабходна актывізаваць будаўніцтва вытворчасцяў па перапрацоўцы камунальных адходаў у мэтах прадухілення іх шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і максімальнага ўцягнення адходаў у абарот у якасці другаснай сыравіны. Не толькі сталіца, але ўсе рэгіёны павінны пастаянна падтрымліваць добры імідж Беларусі — краіны чыстай, прыгожай, зручнай для жыцця людзей і прывабнай для нашых гасцей.

4. АБ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ

Асабліва хачу падкрэсліць, што ўздым эканамічных галін і рэгіёнаў важны ў першую чаргу для павышэння ўзроўню і якасці жыцця людзей. Гэта прамая залежнасць: трэба лепш працаваць, каб лепей жыць.

Рэальны сектар эканомікі ў найбольшай ступені фарміруе бюджэт дзяржавы і тыя рэсурсы, якія інвестуюцца ў развіццё сацыяльнай сферы. Мы раней выбралі і надалей намераны прытрымлівацца сацыяльнай арыентацыі дзяржавы. Пра гэта сведчаць як выдаткі гадавых бюджэтаў краіны, так і перавага ў дзяржаўных праграмах артыкулаў сацыяльнай накіраванасці.

У 2016—2020 гадах плануецца рэалізоўваць больш за 20 дзяржаўных праграм, пры гэтым арыенціровачна дзве трэці бюджэтных сродкаў, выдзеленых на іх фінансаванне, будуць інвеставаны ў сацыяльную сферу. У першую чаргу ў медыцыну, адукацыю, культуру, падтрымку сем'яў, сацыяльную абарону насельніцтва.

Ніводзін чалавек, які апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, не павінен застацца без дапамогі дзяржавы. Гаворка ідзе пра ўкараненне безнаяўных жыллёвых субсідый у мэтах змякчэння наступстваў павелічэння тарыфаў на паслугі ЖКГ.

Падкрэсліваю: іх павелічэнне павінна праводзіцца адначасова са зніжэннем выдаткаў на аказанне паслуг, ростам даходаў людзей і развіццём сістэмы адрасной падтрымкі неабароненых катэгорый грамадзян!

Нельга забываць аб стварэнні зручнага асяроддзя жыццядзейнасці для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Гэта важная задача, і мы яе павінны вырашаць.

На працягу пяцігодкі безбар'ернае асяроддзе будзе створана больш чым на 3,5 тысячы аб'ектаў рэспублікі.

У гэтай пяцігодцы мы прыступім да рэфармавання і сістэмнага ўдасканалення нашай пенсійнай сістэмы. Каб не дапусціць зніжэння ўзроўню пенсій і рэгулярнасці іх выплат, спатрэбілася перагледзець тэрміны выхаду людзей на заслужаны адпачынак. Пастаўлена задача забяспечыць узровень пенсій у памеры 40 працэнтаў ад заработнай платы. Сусветны стандарт.

У праекце праграмы намечаны высокія рубяжы развіцця сацыяльнай сферы. Не буду іх усе пералічваць, спынюся на самых важных напрамках.

Ахова здароўя.

Выдаткі на гэтую сферу складаюць больш за 5 працэнтаў ВУП, прычым дзяржава забяспечвае іх асноўную долю. Гэта апраўдана. Дзяржаўная медыцына — самая прадукцыйная сістэма, якая найлепшым чынам служыць шырокім слаям насельніцтва. Сусветнай супольнасцю высока ацэнены нашы дасягненні ў развіцці гэтай галіны. У рэйтынгу эфектыўнасці аховы здароўя «Блумберг» Беларусь заняла 47-е месца, абышоўшы і Злучаныя Штаты, і Расію.

У апошнія гады шмат што зроблена па тэхнічным абсталяванні медустаноў, падрыхтоўцы кадраў, стварэнні спецыялізаваных цэнтраў у сталіцы і абласцях. Але мы не спыняемся на дасягнутым.

Далейшае развіццё ўсіх звёнаў аховы здароўя — ад ФАПа да цэнтраў — знаходзіцца пад асаблівым кантролем кіраўніцтва краіны і мясцовых органаў улады. Ад стану гэтай сферы шмат у чым залежыць забеспячэнне працяглага і актыўнага жыцця людзей, залогам якога з'яўляецца здароўе. Да 2020 года чаканая сярэдняя працягласць жыцця павялічыцца і перавысіць 75 гадоў. Гэтаму будуць служыць узмацненне прафілактычнай, рэабілітацыйнай работы сістэмы аховы здароўя, пашырэнне ахопу насельніцтва паслугамі першаснай медыцынскай дапамогі, фарміраванне здаровага ладу жыцця і зніжэнне ўплыву фактараў рызыкі.

Усе ўстановы аховы здароўя павінны быць нацэлены перш за ўсё на ранняе дыягнаставанне і лячэнне максімальна шырокага спектра хвароб на якасна высокім узроўні. У гэтым напрамку работа павінна быць узмоцнена.

Неабходна забяспечыць паэтапны пераход да дзейнасці ўчастковай службы па прынцыпе каманды: урач агульнай практыкі, яго памочнік па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе, медсястра.

Да 2020 года трэба павялічыць долю тых, хто працуе па гэтым прынцыпе, да 100 працэнтаў.

Трэба будзе павялічыць аб'ёмы высокатэхналагічных відаў медыцынскай дапамогі, такіх як кардыя- і нейрахірургія, хірургічная афтальмалогія, транспланталогія, эндапратэзаванне, актыўна развіваць тэлемедыцыну, дыстанцыйныя формы маніторынгу здароўя.

Не магу не закрануць шэраг спадарожных пытанняў, вырашэнне якіх даўно наспела. Мы не можам мірыцца з тым, што працягласць жыцця беларусаў меншая, чым у самых развітых краінах Заходняй Еўропы. Бо многія прычыны смяротнасці залежаць ад нас самих.

Недазваляльна вялікая колькасць нашых грамадзян гіне ў дарожна-транспартных здарэннях, на пажарах, на вытворчасці, тоне ў вадаёмах.

Нельга недаацэньваць такую вострую для нашага грамадства праблему, як алкагалізм і наркаманія. У большасці сваёй ад атручвання алкаголем і ўжывання наркотыкаў паміраюць маладыя людзі, якім яшчэ жыць і жыць.

Мерапрыемствы па папярэджанні і пераадоленні п'янства і алкагалізму патрабуюць асаблівай увагі не толькі медыцынскіх і праваахоўных органаў, але і ўсяго грамадства. Бо гэтая бяда наносіць удар як па канкрэтных людзях і сем'ях, так і па генетычным кодзе ўсёй нацыі і іміджу народа. Каму з нас будзе прыемна, калі Беларусь назавуць краінай п'яніц і наркаманаў? Таму і змагацца за здаровы лад жыцця трэба ўсім разам!

Перш за ўсё неабходна стварыць асяроддзе, спрыяльнае для жыццядзейнасці сем'яў (сферы сямейнага вольнага часу, паслуг для сем'яў з дзецьмі). Настойліва прасоўваць у грамадстве пазітыўнае стаўленне да сем'яў, у якіх не дапускаюцца п'янства і іншыя негатыўныя з'явы. Станоўчы прыклад бацькоў — гэта надзейны шлях выхавання з самага ранняга дзяцінства дастойнага чалавека.

Нельга адкладваць вырашэнне гэтых задач. Захады па стварэнні ўмоў, спрыяльных для нараджэння дзяцей, зніжэння смяротнасці, павінны рэалізоўвацца комплексна. Упэўнены, што нашаму грамадству па сілах вырашыць гэтыя задачы і стабілізаваць поспех у росце колькасці беларускага насельніцтва.

Для папулярызацыі моды на здароўе неабходна актыўна выкарыстоўваць таксама фізкультуру і спорт.

Трэба накіраваць фізкультурна-масавую работу на павелічэнне аздараўленчых груп, клубаў па інтарэсах, секцый па відах спорту.

Хацелася, каб і нашы прафесійныя спартсмены, асабліва гульнявых відаў, часцей радавалі мільёны балельшчыкаў і аматараў сваімі паспяховымі выступленнямі і яркімі перамогамі на прэстыжных турнірах і чэмпіянатах. Як учора: невялікая краіна Харватыя разбіла чэмпіёнаў свету і Еўропы неаднаразовых, іспанцаў. Радасць для ўсёй краіны. Ну нам пакуль, як і нашым братам-расіянам, радавацца няма чаму... Будзем імкнуцца да большага.

(Апладысменты.)

Я чаму пра расіян кажу, таму што, калі няма нашых, мы ж перажываем за расіян. А такая сітуацыя ўзнікла, што балець няма за каго ...

Словам, калі мы гаворым пра медыцыну, хачу сказаць адно: нямала зроблена, але хачу папярэдзіць: не расслабляйцеся.

Адукацыя.

Адразу хачу падкрэсліць найважнейшае патрабаванне: сістэма адукацыі не павінна быць адарванай ад эканомікі. Трэба павялічваць арыентаванасць навучання на практыку. Гэта адзіны шлях падрыхтоўкі спецыялістаў, якія валодаюць інфармацыйнымі тэхналогіямі, якія ведаюць усе этапы вытворчасці.

Ідэя бесперапыннай адукацыі, зразумела, не азначае, што чалавек усё жыццё будзе студэнтам. Гаворка ідзе аб адукацыі, якая фарміруе ў чалавеку імкненне да пастаяннага ўдасканалення і самаразвіцця.

Адукацыя — не значыць, што скончыў школу, ВНУ і ўсё, адукаваўся. Не, гэта — аснова, падмурак, там навучылі вучыцца.

А далей мы павінны дзейнічаць самі.

Нічога не змянілася, навіны тут няма.

Сістэма адукацыі павінна выпрацоўваць у людзей здольнасць адаптавацца да зменлівых умоў. Як я кажу: трэба навучыць вучыцца.

Ужо сёння неабходна вызначацца з падрыхтоўкай кадраў для высокатэхналагічных і навукаёмістых галін.

Скажу наступнае: маса праблем у адукацыі. Колькасць ахвотнікаў паходзіць па гэтым полі, патаптацца і нешта там рэфармаваць не скарачаецца. Нядаўна віцэ-прэм'еру новаму (Н.І. Качанавай. — **Заўвага рэд.**) і новаму міністру (М.А. Жураўкову. — **Заўвага рэд.**) была пастаўлена канкрэтная задача: калі мы нічога не можам прыдумаць і прыдумаць нельга, то не нішчыце тое, што ёсць.

(Апладысменты.)

Рабіце так, каб дзеці і людзі маглі атрымаць тое, ну хаця б, што атрымлівалі мы.

Ёсць імкненне нейкіх разумнікаў стварыць мудрагелістую праграму, праграму такую, што матэматычную задачу чалавек — матэматык, фізік сярэдняй рукі — рашыць не можа (у пятым-сёмым класах!). Дык што гэта за праграмы, каму яны патрэбныя, каго мы там рыхтуем?!

Зноў не буду ўдавацца ў падрабязнасці, міністру пастаўлена задача: або — або.

У хуткім часе павінны быць створаны нармальныя падручнікі. Гэта галоўнае, гэта «ікона» ў школе. І іх павінны стварыць найлепшыя настаўнікі нашай школы, а не акадэмікі, якія забыліся, калі вучыліся!

Праблема пераспела. Пераспела! І яе ў гэтай пяцігодцы адназначна павінны вырашыць. Мы можам яе вырашыць. Там, дзе мы стварылі новыя падручнікі для школы агульнаадукацыйнай, для ВНУ (а гэта і ВНУ праблема), там мы маем нармальныя вынікі. Нельга дзяцей перагружаць ў школе з малога ўзросту, мы ж калечым іх!

(Апладысменты.)

Тое ж самае, шмат сёння ідзе спрэчак, і людзі цікавяцца на прадпрыемствах, калі я прыязджаю, — цэнтралізаванае тэсціраванне або класічная здача экзаменаў? Я шчыра прызнаўся: мяне ніхто не схіліў яшчэ ні на той, ні на другі бок. Не трэба спяшацца. Так, ЦТ мае шмат недахопаў, але сёння няма праблем ні з карупцыяй, ні з чым. Усё ж такі людзі туды павінны ісці, у вышэйшую школу, з пэўным узроўнем ведаў, а ЦТ правярае веды. Але вось гэтыя экзамены і пытанні па цэнтралізаваным тэсціраванні павінны быць не для акадэмікаў і выпускнікоў ВНУ, а для школьнай праграмы! Дзеці не павінны атрымліваць псіхалагічных траўмаў, ідучы на гэтае цэнтралізаванае тэсціраванне. Яны павінны здаваць экзамены, у тым ліку метадам цэнтралізаванага тэсціравання, вывучыўшы школьную праграму.

(Апладысменты.)

Аб жыллёвым будаўніцтве.

За апошнія пяць гадоў пабудавана 25 мільёнаў квадратных метраў жылля. Нам трэба ў будаўніцтве павялічваць эфектыўнасць. Нам трэба стварацца сучасныя матэрыялы, каб дом або кватэру можна было пабудаваць хутка, якасна і каб яна доўгі перыяд часу служыла.

У нас сёння жылы фонд спажывае 35-40 працэнтаў энергарэсурсаў краіны. Амаль палова — жылы фонд! Значыць, гэты кірунак для нас вельмі важны і ўсе працэсы там павінны быць удасканалены.

Ставіцца задача пераарыентацыі магутнасцяў галіны на экспарт паслуг — праектаванне і здача аб'ектаў пад ключ.

Больш актыўна будзем развіваць індывідуальнае будаўніцтва.

Я казаў пра будматэрыялы з высокімі тэхнічнымі характарыстыкамі, да 2020 года мы павялічым выпуск іх да 85 працэнтаў. Гэта дапаможа знізіць сабекошт квадратнага метра да ўзроўню сярэднямесячнай зарплаты па краіне.

Неабходна забяспечыць даступнасць крэдытных рэсурсаў для насельніцтва.

За пяцігодку мы плануем пабудаваць звыш 18 мільёнаў квадратных метраў жылля, у тым ліку 1,55 мільёна — для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу.

Падтрымка сям'і.

У сістэме каштоўнасцяў беларусаў сям'я займае лідзіруючую пазіцыю. Мы будзем прымяняць механізмы падтрымкі сям'і. Такія, як фарміраванне мацярынскага капіталу, аказанне дапамогі шматдзетным сем'ям да навучальнага года, прадастаўленне шырокага спектра сацыяльных паслуг сем'ям з дзецьмі.

Мы не павінны дапускаць таго, каб з нараджэннем кожнага наступнага дзіцяці зніжаліся і магчымасці для бацькоў для пошуку перспектыўнай працы.

Сёння ёсць пытанні з дзіцячымі садкамі, асабліва ў буйных гарадах — там, дзе ствараюцца новыя мікраёны. Мы будзем будаваць дзіцячыя сады, толькі трэба падумаць, што рабіць з дзіцячымі садамі ў цэнтры, дзе ўжо жывуць людзі, якія чамусьці зусім не нараджаюць.

У выніку наша задача — захаваць станоўчыя тэндэнцыі нараджальнасці насельніцтва і забяспечыць дэмаграфічную бяспеку.

Культура і мастацтва.

Год культуры. У нас намечаны шэраг мерапрыемстваў у гэтым кірунку, мы іх рэалізоўваем. Для культуры зроблена нямала: і па рэканструкцыі, па рэфармаванні. Але для таго, каб наш народ быў культурным, ёсць усё, каб ён лічыўся культурным. Трэба культурным работнікам трошкі варушыцца, быць больш ініцыятыўнымі, раскаванымі і не глядзець увесь час у рот дзяржаве. Акцэнт трэба зрабіць як на маштабы і якасны бок нашай культурнай сферы, так і на павышэнне яе турыстычнай прывабнасці.

Творы літаратуры, музычнага, выяўленчага, тэатральнага і кінамастацтва, якія ствараюцца, закліканы садзейнічаць фарміраванню каштоўнасцяў беларускага грамадства, адлюстроўваць духоўны вопыт нацыі. Наша мэта — не самаізаляцыя, не процістаянне іншых культур, а ўзаемадзеянне і ўзаемаўзбагачэнне.

Падкрэсліваю: адметнымі рысамі культуры беларускага народа з'яўляюцца ўзаемная павага, непрыманне любых формаў міжнацыянальнай варожасці. Гэтыя прынцыпы мы падтрымлівалі і будзем падтрымліваць далей!

Беларусь сёння — цытадэль традыцыйнай культуры і маралі. Так будзе заўсёды.

(Апладысменты.)

5. ПРА ЎНУТРАНУЮ ПАЛІТЫКУ

Найважнейшай умовай для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі з'яўляецца палітычная стабільнасць, спакой у грамадстве, забеспячэнне непарушнасці межаў і бяспекі людзей. Менавіта гэтаму закліканы служыць наша ўнутраная і знешняя палітыка.

Адразу хачу падкрэсліць: ніякай ломкі палітычнай сістэмы, якая ў нас склалася, не будзе! Як я ўжо неаднаразова казаў, ліміт рэвалюцый і катастроф народ вычарпаў у мінулым стагоддзі. А цяпер ён хоча жыць у міры і дастатку, ствараючы, а не руйнуючы свой дабрабыт і дабрабыт сваёй маладой і суверэннай дзяржавы.

Калі нехта мае надзею пахіснуць нашу стабільнасць у перыяд такой важнай палітычнай кампаніі, як парламенцкія выбары, то іх, гэтыя спробы, трэба пакінуць убаку.

Мы надаём вялікае значэнне таму, якім будзе новы дэпутацкі корпус, каму народ акажа свой давер. Я ўжо казаў пра тое, што не сумняваюся ў гэтым, народ выбера самых годных. Крытэрыі ацэнкі кандыдатаў у людзей розныя, але большасць сыходзіцца на тым, каб падтрымаць тых, хто выступае, па-першае, за суверэнітэт і незалежнасць Беларусі.

Па-другое, за мірны і эвалюцыйны шлях развіцця.

Па-трэцяе, за ўздым айчынных прадпрыемстваў.

Да чацвёртага крытэрыю адносім прафесіяналізм, кампетэнтнасць, здольнасць вырашаць задачы, якія стаяць перад грамадствам.

Пяты — сумленнасць, прыстойнасць, уменне трымаць слова.

Шосты — чалавечнасць, спагадлівасць на клопаты людзей, даступнасць і ўменне мець зносіны, адсутнасць фанабэрыі і ганарыстасці.

Сёмы — вопыт паспяховай працы ў той ці іншай сферы.

Восьмы — канструктыўная праграма дзеянняў у якасці дэпутата.

Дзявяты — уменне бачыць перспектыву, вылучаць галоўнае і істотнае ў чарадзе будзённых з'яў.

Дзясяты — адданасць сваёй дзяржаве і народу.

Гэта прыкладны пералік тых якасцяў, якія ў грамадскай думцы сфармаваліся ў адносінах да таго, якім павінен быць дэпутат.

Прама скажу, менавіта такіх людзей я хацеў бы бачыць у новым складзе парламента. Адказныя перад імі будуць стаяць задачы па ўдасканаленні прававой базы, развіцця супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, умацаванні пазіцый Беларусі на міжнароднай арэне.

У сённяшніх умовах, калі ёсць пэўныя складанасці ў эканоміцы, велізарная адказнасць кладзецца на нашы прафсаюзы. Прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў ёсць на большасці нашых прадпрыемстваў. Трэба аддаць належнае, што цяперашняе кіраўніцтва прафсаюзаў вельмі аператыўна выконвае маю просьбу і даручэнне працаваць у прыватных калектывах. Там таксама людзі, нашы людзі, і іх трэба падтрымліваць і абараняць.

Кіраўніцтва прафсаюзаў і прафсаюзы актыўна сябе паводзяць, калі ўзнікаюць нейкія цяжкасці на прадпрыемствах. Гэтыя пытанні і праблемы яны бачаць, іх вырашаюць.

У цэлым, шчыра кажучы, я задаволены працай цяперашніх прафсаюзаў.

Але трэба зразумець адно: у нас сёння няма кампартыі, якая калісьці была і якая несла велізарную нагрузку па выхаванні, ідэалагічным выхаванні нашага грамадства, таму ўсё кладзецца на нас, на вертыкаль улады. А паколькі партый якраз нармальных яшчэ і сапраўдных няма, яны не сфарміраваныя, трэба абапірацца на тое, што ёсць: і на нашы маладзёжныя арганізацыі, і на нашы ветэранскія арганізацыі, трэба абапірацца на наш Саюз жанчын, на нашы прафсаюзы. Трэба іх выкарыстоўваць для таго, каб вырашаць тыя праблемы, якія вырашала калісьці Камуністычная партыя, якая рабіла нямала для таго, каб краіна развівалася. Ну а калі нямa, значыць, трэба замясціць, пакуль не сфарміраваўся гэты партыйны рынак, калі можна так сказаць, трэба іх замясціць дзейнымі арганізацыямі, якія выступаюць за суверэнітэт і развіццё нашай краіны.

Сённяшняя глабалізацыя, фундаментальныя зрухі ў сусветнай эканоміцы ставяць перад намі, як і перад іншымі краінамі, новыя задачы, у вырашэнні якіх маюцца розныя варыянты.

Шчыра скажу, нам варта выбраць лепшыя з іх, каб энергічна рухацца наперад да матэрыяльнага дастатку, духоўнага багацця, дабрабыту кожнага грамадзяніна, да росквіту роднай Беларусі. Але для гэтага ў першую чаргу патрэбны адзінства і згода ў грамадстве, мір і парадак у краіне.

Галоўнае цяпер — выкарыстоўваць любы шанц і магчымасць пераадолець усе цяжкасці на шляху прагрэсу і стварэння, не паддавацца дэпрэсіі ды застою; захоўваючы ўсё лепшае з мінулага, упэўнена рухацца да мэты. Толькі той, хто ідзе, адолее дарогу!

Упэўнены, мы зможам паспяхова стварыць і развіваць новыя галіны эканомікі, для гэтага ёсць усе перадумовы. Можам надаць магутны імпульс уздыму традыцыйных галін за кошт інфарматызацыі і новых тэхналогій, а таксама аптымальных метадаў кіравання.

Можам стаць адным з ключавых цэнтраў прыцягнення капіталаў, развіцця лагістычнай сістэмы і ўвайсці ў лік перадавых краін свету.

Усё залежыць ад нас, ад нашага выбару і настойлівасці ў дасягненні пастаўленых мэт. Жыццё паказвае, што мэтанакіраванасць народа здольная творыць цуды!

Мне бачыцца Беларусь праз пяць гадоў памацнелай і квітнеючай, незалежнай і дружалюбнай, прыгожай і ўтульнай для жыцця людзей. Так і будзе!

Не навязваючы вам свайго меркавання, хачу заўважыць, што праект праграмы, вынесены на ўсенароднае абмеркаванне, з'яўляецца рэалістычным, ён улічвае нашы магчымасці, у той жа час дазваляе значна прыбавіць па ўсіх найважнейшых параметрах.

Таму я б вас прасіў, запрашаю удзельнікаў сходу да актыўнага абмеркавання нашых планаў. Аналізуйце іх, прапануйце, як больш эфектыўна разам нам працаваць, каб жыць лепей і лепей.

Дзякую за ўвагу.

(Працяглыя апладысменты.)

■ Меркаванні

Аляксандр КОСІНЕЦ, Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь:

— У сваім дакладзе Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка надаў асаблівую ўвагу пытанням не толькі абароназдольнасці нашай дзяржавы, але і даў адказы, чаму мы менавіта сёння праводзім пяты Усебеларускі народны сход і чаму пасля прэзідэнцкіх выбараў. Таму што бачым, як развіваецца сусветная эканоміка, які нам неабходна трымаць курс, якія трэба, адпаведна, праводзіць рэформы ва ўсіх без выключэння кірунках і галінах. І ў аграпрамысловым комплексе, і ў будаўніцтве, і ў пытаннях развіцця высокаінтэлектуальнага грамадства. Як развіваць навуку, адукацыю, культуру.

Мы не ўтойваем сваіх недахопаў, таму паказалі вынікі пяцігодкі 2011—2015 гадоў. Так, нам не ўдалося выканаць усе прагнозныя паказчыкі, але мы ідзём шляхам іх дасягнення, дэманструем прынцыповыя падыходы: перш за ўсё тое, што хвалюе чалавека. Гэта заработная плата, і мы, натуральна, плануем яе павышэнне ў наступнай пяцігодцы. Таксама пытанні, звязаныя з інфляцыяй. Таму ставім задачу, каб яна склала не болей за 5% і не было росту цэн. Гэта і пытанні эканомікі, бо ў нас экспартна арыентаваная эканоміка, і яна перш за ўсё павінна даваць грашовыя рэсурсы і для разліку з нашымі замежнымі партнёрамі, і для напаўнення золатавалютнага запасу.

Гэта і галоўныя пытанні, на якія трэба адказаць людзям: як можна будзе будаваць жыллё, набываць матэрыяльныя даброты і працягваць род чалавечы. Плануецца, што сярэдняя працягласць жыцця складзе 75 гадоў у 2020 годзе. Няма ніводнай тэмы ці пытання, якія б хвалявалі людзей, але засталіся неагучанымі. Больш за тое, на «гарачую лінію» паступіла за дзень больш за 300 тэлефонных званкоў. Мы іх сістэматызуем і дадзім адказы. Таксама вёўся прыём грамадзян у Віцебску, Брэсце, Мінску, Магілёве, Гомелі, Гродне — амаль па ўсёй краіне.

Мы робім вялікі акцэнт на стратэгічны рэсурс нашага грамадства — нашу моладзь. Каб у яе была магчымасць атрымліваць якасную адукацыю, праяўляць свае таленты, каб належным чынам падтрымліваліся маладыя сем'і, каб моладзь не з'язджала. Для гэтага патрэбна добрая матывацыя. У той жа час нам варта істотна павышаць заработную плату. Але тут трэба дзейнічаць не надуманымі схемамі, а зарабляць яе. Для гэтага варта ствараць адпаведныя ўмовы: падтрымліваць малы і сярэдні бізнес.

Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:

— У мяне ёсць упэўненасць, што мы ўсё можам. Але для гэтага трэба быць разам. Пяты Усебеларускі народны сход паказаў, наколькі наш народ адзіны. Мяне больш за ўсё зацікавіла міжнародная сфера. Прэзідэнт агучыў прыярытэты: палітыка застаецца шматвектарнай, мы супрацоўнічаем з усімі дружалюбнымі да нас краінамі. У народзе кажуць, што нельга ўсе яйкі класці ў адзін кошык: нельга экспарт скіроўваць у адну краіну. Пра дыверсіфікацыю экспарту Прэзідэнт казаў і агучыў рэгіёны, з якімі мы цяпер найбольш актыўна супрацоўнічаем: Лацінская Амерыка, Афрыка, Кітайская Народная Рэспубліка, АСЕАН. Кантакты гэтыя развіваюцца і на палітычным, і на парламенцкім, і на эканамічным узроўні. Таму я думаю, што яшчэ адзін пасыл для ўсіх — гэту працу варта працягваць і развіваць углыб.

Протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ, настаяцель Усіхсвяцкага прыходу Мінска:

— Сход, на якім абмяркоўвалася сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, адбываецца не ў самых лепшых умовах, якія склаліся на сёння не толькі ў Беларусі, але і ў свеце. У сувязі з гэтым мне ў галаву прыйшлі незвычайныя думкі. Не паверыце, але... са сферы гандлю. Мне хочацца паразважаць над сачавічнай поліўкай. У Бібліі ёсць аповед пра Ісава і Іакава. Ісаў — старэйшы брат, Іакаў — малодшы. Ісаў па першародстве валодае правам атрымання ў спадчыну бацькоўскай маёмасці і статусу, Іакаў — не, але моцна гэтага жадае. Аднойчы Іакаў прадаў галоднаму і стомленаму Ісаву сачавічны суп за правы першародства. І той з лёгкасцю пагадзіўся, за што Бог пракляў яго, і Ісаў стаў бадзягам. Можна падумаць, што гэта несправядлівае пакаранне. Зусім не. Бо Ісаў павінен быў атрымаць у спадчыну ад Аўраама ўсе абяцанні Бога. Але, пагадзіўшыся з аднахвілінным жаданнем, Ісаў адмовіўся быць бацькам Богам абранага народу. І тым самым здрадзіў яму і запавету, які заключыў Бог з Аўраамам. Таму правы першародства былі аддадзены Іакаву.

Да чаго гэта я? На мой погляд, зараз перад кожным беларусам у духоўным плане стаіць выбар: суп ці правы першародства. Хвілінны асабісты камфорт ці напружанне сіл дзеля стварэння дзяржавы і нацыі. Па сутнасці, мы цяпер знаходзімся на пачатку шляху фарміравання нацыі. Беларусы спрадвеку называліся народам. Але зараз мы можам казаць пра зараджэнне беларускай нацыянальнай самасвядомасці.

Мы як нацыя набываем свае адметныя рысы: гэта прынцып клопату пра кожнага чалавека, міралюбства ва ўсіх нашых адносінах і сувязях і нейтралітэт, гэта працавітасць і прага ведаў, вялікае цярпенне і пачуццё справядлівасці, цвёрдасць у прынцыпах, якая грунтуецца на духоўным разуменні дабрыні і хрысціянскіх каштоўнасцях, гатоўнасць абараняць роднае, не шкадуючы жыцця свайго. Перад намі няма зачыненых дзвярэй. Прымаюць нашу дзяржаву ці не, але наша слова мае вагу.

І нам трэба быць мужнымі да канца, адстойваючы ісціну прыярытэтаў маральнасці ва ўсіх сферах жыццядзейнасці.

Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы:

— Для мяне важна, што ў прамове Прэзідэнта былі агучаны тыя праблемы, якія пакуль застаюцца нявырашанымі. Толькі адкрытая размова пра недахопы можа быць гарантыяй далейшага развіцця. Калі сябе супакойваць, што ў нас усё добра і нам няма ў чым паляпшацца, то гэта можа прывесці да адмоўных наступстваў. У гэтым выпадку такога не адбылося. І добра. Гэта тычыцца і нашай працы ў межах Саюзнай дзяржавы і Еўразійскага эканамічнага саюза. Дакладней, узгаднення і стварэння адзінай структурнай прамысловай палітыкі. Ускосна гэта тэма кіраўніком дзяржавы таксама была паднятая, і гэта пацвярджэнне таму, што яна сёння надзённая і актуальная.

■ Гарачая лінія

БОЛЬШАСЦЬ ПЫТАННЯЎ — ПРА ЖКГ

«Па звестках на 17 гадзін паступіла больш за 300 пытанняў», — паведаміў Аляксей ЦВЯТКОЎ, кіраўнік гарачай тэлефоннай лініі пятага Усебеларускага народнага сходу. Па яго словах, большасць пытанняў тычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі — 28%.

Акрамя таго, шмат зваротаў было наконт сферы будаўніцтва і сацыяльнага забеспячэння. «Асноўная колькасць тых, хто дазваніўся, — грамадзяне Беларусі. Каля 40% — жыхары Мінска. Каля 70% званкоў паступіла ад жанчын», — удакладніў Аляксей Цвяткоў.

Учора, 22 чэрвеня, на форумах у беларускай інтэрнэт-прасторы з'явіліся паведамленні, што на «гарачую лінію» немагчыма дазвaніцца. Па словах супрацоўнікаў, якія забяспечвалі тэлефонную сувязь, гэта адбылося з-за яе перагружанасці, бо ўвесь дзень тэлефоны не змаўкалі. За кожным апаратам працуюць па некалькі чалавек для таго, каб адказаць на як мага большую колькасць званкоў. Многія з тых, хто дазваніўся, былі расхваляваныя да слёз. Карэспандэнт «Звязды» застала такі момант, калі аператар клапатліва супакойвала расчуленую пенсіянерку.

Усе звароты на гарачую тэлефонную лінію сходу рэгіструюцца, тэматычна размяркоўваюцца і перадаюцца ў групу, якая займаецца адказамі на пытанні. У яе склад уваходзяць намеснікі кіраўнікоў дзяржаўных органаў, адказныя супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта і апарата Савета Міністраў. Адначасова працуюць рэгіянальныя і галіновыя штабы.

Учора «гарачая лінія» працавала з 11.00 да 18.00, а сёння, 23 чэрвеня, — з 10.00 да 13.00. Кожны ахвотны можа патэлефанаваць па шматканальных тэлефонах: 8-017-276-00-00, 8-017-282-00-00, каб задаць пытанні, выказаць пажаданні. «Гарачую лінію» абслугоўваюць 14 аператараў на 7 шматканальных тэлефонах.

Вераніка ПУСТАВІТ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.